


СТАРТ НОВЫХ МАГЧЫМАСЦЯЎ 5

АДПАЧНЁМ АД СПЁКІ 16



Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

+TV ПРАГРАМА

26 ЛІПЕНЯ 2024 г. ПЯТНІЦА № 144 (30278)

## КОРАТКА

● Памер БПМ павялічыцца з 1 жніўня на 3,4 працэнта і складзе Br433.

● **Мінсельгасхарч: завяршыць уборку збожжавых без уліку грэчкі і проса плануецца да 8-10 жніўня.**

● Зацверджана новая рэдакцыя інструкцыі аб парадку правядзення валютна-абменных аперацый.

● **Беларусы за паўгода павялічылі электраспажыванне для ацяплення і гарачага водазабеспячэння ў 1,4 раза.**

● У Магілёўскай вобласці пасля ўмяшання КДК у сельгасабарот уцягнута каля 300 га зямель.

● **У Беларусі кожнае пятае дзіця мае праблемы з лішняй вагой.**

● Захворванне на вострыя гепатыт В за дзесяць гадоў у Беларусі знізілася ў пяць разоў.

● **Даследную вытворчасць гумінавых угнаенняў адкрылі ў Ляхавіцкім раёне.**

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Андрэй ШВЕД, Генеральны пракурор:**

*«Ва ўмовах глабальнай лічбавізацыі кібербяспека крытычнай інфраструктуры і вялікіх даных набыла выключнае значэнне для ўстойлівасці ўсіх формаў жыццядзейнасці. Так, у Беларусі на фоне зніжэння агульнай колькасці злачынстваў больш чым у два разы за апошнія 15 гадоў у апошні час адзначаецца тэндэнцыя росту колькасці кіберзлачынстваў. Летась іх колькасць вырасла амаль на чвэрць і склала больш за 18 тысяч. Кожнае пятае злачынства ў краіне здзейснена з выкарыстаннем інфармацыйна-камунікацыйных тэхналогій».*

ISSN 1990 — 763X

# АБ ВАЖНЫХ РЭЧАХ — У ЗНАКАВЫМ МЕСЦЫ

## Прэзідэнты Беларусі і Расіі сустрэліся на востраве Валаам

**Учора Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка прыбыў з рабочым візітам у Расійскую Федэрацыю. Борт беларускага лідара здзейсніў пасадку ў аэрапорце Санкт-Пецярбурга. Але маршрут кіраўніка дзяржавы працягнуўся ў бок Ладажскага возера, на востраў Валаам у Карэліі.**

Менавіта там і сустрэліся лідары дзвюх краін. Дарэчы, Аляксандр Лукашэнка і Уладзімір Пуцін раней ужо двойчы разам наведвалі гэты востраў. Летась — таксама ў ліпені — яны наведалі размешчаны на востраве Спаса-Праабражэнскі Валаамскі мужчынскі манастыр. А першы раз прэзідэнты разам пабывалі на Валааме ў ліпені 2019 года.

На тэрыторыі Спаса-Праабражэнскага Валаамскага мужчынскага манастыра кіраўнікі дзяржаў наведалі Храм Смаленскай іконы Божай Маці на тэрыторыі Смаленскага скіта. Затым прэзідэнты зайшлі ў капліцу Царскіх Страстацерпцаў.

Аляксандр Лукашэнка і Уладзімір Пуцін прадоўжылі размову ў закрытым фармаце. На парадку дня візіту Прэзідэнта Беларусі ў Расію — перагаворы з Уладзімірам Пуціным у розных фарматах. Тэмы — самыя актуальныя: пытанні ў развіцці беларуска-расійскіх адносін, прасоўванне саюзных праектаў, рэгіянальная бяспека і міжнародны парадак дня.

**Паводле прэс-службы Прэзідэнта.**



Фота БелТА.

Жніво-2024

# Меню для механізатара

**У гаспадарцы Клічаўскага раёна ААТ «Нясята-Агра», як і ў любой іншай, сёння горача. Механізатары, вадзіцелі, паляводы спяшаюцца раніцай на палеткі, а кухары хутчэй бягуць да сваіх каструль і патэльняў. У клічаўскай кавярні «Смак дома», якая абслугоўвае работнікаў гаспадаркі, з раніцы ўжо лунаюць апетытныя пахі, а ў духавой шафе падрумяньваюцца сочныя катлеткі. Загадчыца кавярні і кухар 5-га разраду ААТ «Нясята-Агра» Алеся ОСІПАВА асабіста чаруе над меню для работнікаў жніва. Ведае, што як людзей накорміш, такі і ўраджай будзе. Гэта праверана.**

— Толькі для нашых работнікаў, якія занятыя на жніве, мы гатуем у сярэднім 30 абедаў і каля 14 вячэр, — кажа яна. — Аб'ёмы гэтым не абмяжоўваюцца, мы кормім яшчэ і гараджан. Але ў першую чаргу клапоцімся пра тых, хто займаецца ўборкай ураджаю. Ужо ў 11 гадзін загружаем у «ГАЗель» усё неабходнае і адпраўляем у поле. Адлегласці немалыя, трэба каля 30 кіламетраў пераадолець, каб даставіць ежу на месца. Гэта, лічы, другі бок Клічаўскага раёна.

СТАР. 3



Спецыяльны рэпартаж

# ПРАЦАВАЛІ БЕЗ ПЕРАПЫНКУ І ДНЁМ, І НОЧЧУ

## Як ліквідуюць наступствы ўрагану ў Крупскім раёне

**Сарваныя дахі і пашкоджаныя лініі электраперадачы, паваленыя дрэвы і платы пакінула пасля сябе стыхія, якая пранеслася па асобных рэгіёнах нашай краіны. У ліку пацярпелых рэгіёнаў — Гомельская і Магілёўская вобласці, а таксама некаторыя раёны Мінскай вобласці. Да ліквідацыі наступстваў прыступілі неадкладна, а аднаўленчыя работы ўзяў на кантроль Прэзідэнт Беларусі. Карэспандэнты «Звязды» выехалі ў гарадскі пасёлак Халопенічы Крупскага раёна, дзе пагутарылі з відавочцамі буры і тымі, чые дамы і ўчасткі ад яе пацярпелі. А заадно даведаліся, як гарадскі пасёлак вяртаецца да нармальнага жыцця.**

### «ДА РАБОТ ДАЛУЧЫЛІСЯ ЎСЕ»

У Халопенічах асноўны ўдар непагадзі прыняла на сябе цэнтральныя вуліцы — Савецкая і Карла Маркса. Дахі многіх дамоў вецер знёс цалкам, дрэвы павалію на агароды, а ад парнікоў увогуле нічога не засталося.

СТАР. 4



Фота Віктара ІВАНЧЫКАВА.

Прыярытэты

# КАБ ЦЭНЫ НЕ «КУСАЛІСЯ»

## Інфляцыя паспяхова кантралюецца

**Як адзначыў міністр антыманапольнага рэгулявання і гандлю Аляксей БАГДАНАЎ, інфляцыя, або індэкс спажывецкіх цэн, з'яўляецца важнейшай тэмай для нашай дзяржавы.**

«Задача стаіць на гэты год вельмі сур'ёзная — інфляцыя не павінна перавысіць 6 %. Яна зафіксавана ўказам кіраўніка дзяржавы, і нам неабходна забяспечыць выкананне гэтага паказчыка. Ёсць механізм кантролю і забеспячэння ўзроўню запланаванай інфляцыі. Міністэрства антыманапольнага рэгулявання і гандлю распрацоўвае спецыяльныя тарыфны сшытак — дарожную карту, у якой дакладна прапісваецца на ўвесь год, на што мы будзем цэны павышаць, а на што не будзем. Акрамя таго, мы яшчэ распісваем памесячны графік прагнозу інфляцыі так, каб да канца года трапіць ва ўстаноўленыя параметры, адсочваем яго выкананне, праводзячы глыбокі аналіз па ўсіх групах тавараў і па ўсіх абласцях, дзе, на што і як растуць цэны», — адзначыў Аляксей Багданаў.

### НІЖЭЙ, ЧЫМ У СУСЕДЗЯЎ

Па выніках шасці месяцаў гадавая інфляцыя (у параўнанні з чэрвенем 2023 года) склала 5,8 %. У параўнанні са снежнем 2023-га — 3,4 %. «Гэта значыць, мы нават яшчэ маем запас у параўнанні з прагнознымі параметрамі. Хачу адзначыць, што інфляцыя ў Беларусі склалася ніжэйшая, чым у нашых краін-партнёраў. Напрыклад, у Казахстане гадавая інфляцыя склала 8,4 %, а ў Расіі — 8,6 %. Хтосьці скажа, што ў Еўропе дзесьці ніжэй рост цэн у гэтым го-

**З нагоды**

### ГАНДАЛЬ АДЗНАЧАЕ ЮБІЛЕЙ

Спаўняецца 100 гадоў з дня заснавання Народнага камісарыята па ўнутраным гандлі БССР. Кіраўнік дзяржавы падтрымаў рашэнне аб заснаванні юбілейнага медаля, прысвечанага стагоддзю органаў гандлю Беларусі. У гандлёвай сферы задзейнічана больш за 600 тысяч чалавек. І традыцыйна яна трымае другое месца па ўкладзе ў ВУП нашай краіны, забяспечваючы практычна яе 10 %, адзначыў міністр.

На рынку працуюць 129,5 тысячы адзінак рознічных гандлёвых аб'ектаў. У Беларусі 590 гандлёвых цэнтраў. Зарэгістравана больш за 30 тысяч інтэрнэт-крам. Іх доля ў рознічным тавараабароце дасягнула 8 %. «Грамадскае харчаванне таксама актыўна развіваецца. Функцыянуе 25,5 тысячы аб'ектаў. Гэта кавярні, рэстараны, сталовыя, розныя пункты грамадскага харчавання. Яны павялічваліся ў колькасці», — адзначыў Аляксей Багданаў.

дзе, але ўлічыце, што ў апошнія два гады інфляцыя там зашкальвала», — звярнуў увагу кіраўнік МАРГ.

«Міністэрства антыманапольнага рэгулявання і гандлю адсочвае ўсе рашэнні ўпаўнаважаных дзяржаўных органаў аб падняцці цэн вышэй за тыя параметры, якія закладзены ў пастанове». За першае паўгоддзе было прынята 261 такое рашэнне. Мы кожны месяц аналізуем і часам выносім рашэнне аб адмене такіх мер. За першае паўгоддзе мы адмянілі 42 рашэнні аб павышэнні цэн. І гэтую работу будзем праводзіць і далей», — падкрэсліў Аляксей Багданаў.

Міністэрства трымае на пастаянным жорсткім кантролі пытанні цэнаўтварэння, насычэння рынку і, вядома, станоўчых фінансавых паказчыкаў работы суб'ектаў гандлю. У ліку асноўных задач на другое паўгоддзе міністр назваў захаванне цэнавай стабільнасці, недапушчэнне ўсплёску цэн на ўнутраным рынку, захаванне забяспечанасці ўнутранага рынку шырокім асартыментам якасных тавараў як беларускай, так і замежнай вытворчасці.

### МАНІТОРЫНГ ПА ЎСІМ ЛАНЦУЖКУ

**Начальнік аналітычнага ўпраўлення Міністэрства антыманапольнага рэгулявання і гандлю Ірына ІВАНОЎСКАЯ** расказала аб мерах па кантролі за цэнамі: «У апошнія 10 гадоў са студзеня да чэрвеня цэны раслі ў сярэднім на 5 %. Таксама варта адзначыць, што ўсе кампаненты індэкса спажывецкіх цэн па выніках паўгоддзя склаліся ў межах устаноўленай мэты. Падтрыманню інфляцыі ў мэтавай траекторыі ў першую чаргу спрыяе дзяржаўнае рэгуляванне цэн — шырока вядомая ўсім пастанова ўрада № 713, якой ахоплена рэгуляванне цэн на спажывецкія тавары як айчыннай вытворчасці, так і імпартныя. Яна ўводзілася ў чацвёртым квартале 2022 года як мера ў адказ на знешнія шокі, якія справакавалі некіравальны рост цэн на ўнутраным рынку», — сказала Ірына Іваноўская.

Праграма дзеянняў урада і Камітэта дзяржаўнага кантролю па стабілізацыі цэн уключае шэраг мер па насычэнні ўнутранага рынку, комплекс мер эканамічнага і адміністрацыйнага характару, а таксама меры па ўдасканаленні антыманапольнага і цэнавага рэгулявання і кантролю. «Меры па насычэнні ўнутранага рынку таварамі актыўна рэалізуюцца. У прыватнасці, адно з мерапрыемстваў — пашырэнне льготнага спажывецкага крэдытавання, стымулюючага набыццё айчынных тавараў, у рамках пастановы № 992. Таксама мы карэктуем механізмы фарміравання і выкарыстання стабілізацыйных фондаў на міжсезонны перыяд. Гэта работа праведзена летась, паказала сваю эфектыўнасць і сёлета прадоўжана. Таксама актыўна ідзе праца па пашырэнні вытворчасці агародніны ў закрытым грунце і пераважнай далейшай іх рэалізацыі на ўнутраным рынку», — удакладніла Ірына Іваноўская.

Што датычыцца мер па ўдасканаленні цэнавага рэгулявання і кантролю, то рэалізуецца пілотны праект па выбудоўванні сістэмы аўтаматызаванага аналізу цэн на тавары, якія пастаўляюцца на ўнутраны рынак. Гэтая работа вядзецца ў тым ліку ў рамках праграмы па стрымліванні цэн і ў мэтах выканання даручэння кіраўніка дзяржавы забяспечыць стварэнне эфектыўнай сістэмы кантролю цэн на ўнутраным рынку. Гэтым займаецца МАРГ сумесна з Банкам развіцця, Дзяржаўным мытным камітэтам, Міністэрствам па падатках і зборах, гандлёвымі сеткамі і іншымі зацікаўленымі.

«Асноўная задача — гэта аўтаматызаваны аналіз і маніторынг цэн на тавары па ўсім ланцужку руху тавараў. Па выніках працы мы атрымаем прадукт, які дазволіць МАРГу ў рэжыме анлайн кантраляваць ланцужкі змянення цэн ад этапу ўвозу тавару ў краіну або яго вытворчасці ўнутры краіны да продажу ў рознічнай сетцы, — патлумачыла Ірына Іваноўская. — З нагоды іншых мер праграмы стрымлівання цэн, напрыклад, прынята пастанова міністэрства, якой прадугледжана істотнае пашырэнне пераліку тавараў, абавязковых да наяўнасці для рэалізацыі ў гандлёвым аб'екце».

Таксама МАРГ сумесна з Беларускай гандлёва-прамысловай палатай распрацаваў механізм маркіроўкі беларускіх тавараў на маркетплейсах шляхам адлюстравання спецыяльных сімвалаў у картках такіх тавараў. Напрыклад, «Зроблена ў Рэспубліцы Беларусь», «Зроблена ў Беларусі».

### ШАНАВАЦЬ СВАЁ, КУПЛЯЦЬ АЙЧЫННАЕ

«Мы назіраем рост продажу тавараў айчыннай вытворчасці. Можа быць, не ўсе тавары так добра прадаюцца, але ў цэлым вялікая частка актыўна набірае аб'ём, гэта дзякуючы той палітыцы, якая праводзіцца ў нашай краіне па імпартазамяшчэнні, па прасоўванні айчыннай прадукцыі. І мы бачым, што прадпрыемствы-вытворцы актыўна прасоўваюць сябе ў гандлёвых сетках», — адзначыў Аляксей Багданаў.

Паводле інфармацыі міністра, значны рост продажаў айчынных тавараў адзначаецца па плодаагароднінай прадукцыі, дзіцячым харчаванні, цукрыстым кандытарскім вырабам, сырам, масле сметанковаму і практычна па ўсіх групах нехарчовых тавараў. Што датычыцца агульных паказчыкаў па продажах беларускай і імпартнай прадукцыі, то рост гандлю назіраецца па свежых садавіне і агародніне, арэхах, яблыках, бульбе, агурках, цыбулі, рыбе, мінеральнай вадзе і іншых таварах.

«Традыцыйна складана рухаліся ў нас нехарчовыя групы тавараў, але бягучае паўгоддзе паказвае і тут значнае павелічэнне продажу», — падкрэсліў кіраўнік ведамства. Напрыклад, продаж новых аўтамабіляў, паводле яго інфармацыі, вырас у першым паўгоддзі на 71 %, тэлевізараў — на 5,6 %, халадзільнікаў і маразільнікаў бытавых — на 13,2 %, сродкаў бытавой хіміі — на 11,8 %, верхняга адзення — на 10 %, панчошна-шкарпэткавых вырабаў — на 3,3 %, парфумерна-касметычнай прадукцыі — на 5,9 %.

Паводле слоў міністра, прырастае і доля продажу беларускай прадукцыі на ўнутраным рынку. Доля беларускіх яблыкаў на ўнутраным рынку практычна дасягнула 60 %, бульбы — 94 %, капусты — 85 %, агуркоў — 95 %, рэпчатай цыбулі — 78 %. Каля 100 % на ўнутраным рынку традыцыйна займаюць мяса-малочная прадукцыя і хлебабулачныя вырабы айчыннай вытворчасці.

Што датычыцца нехарчовай групы тавараў, то ў тройцы лідараў па росце долі продажу на ўнутраным рынку бытавая хімія (38 %), халадзільнікі (24,3 %) і пральныя машыны (21,4 %).

### ШТО З «ВОСТРАВАМ ЧЫСЦІНІ»?

Аляксей Багданаў пракаментаваў сітуацыю з гандлёвай сеткай «Востраў чысціні і густу». У міністэрстве нейкіх вялікіх праблем з банкруцтвам гэтай сеткі не бачаць, паколькі ўдзельнікаў на рынку з аналагічнымі таварамі досыць шмат.

«Чаму гэтая сітуацыя ўзнікла? Даўняя гісторыя, яны досыць даўно ішлі да такога няўдалага завяршэння. Калі мы даведаліся пра гэта, узялі працэс пад свой кантроль, спрабавалі ўсімі сіламі неяк дапамагчы ў рамках нашай кампетэнцыі, але ў іх сфарміраваўся за апошнія пяць гадоў сапраўдны камяк праблем. Гэта не імгненныя цяжкасці, праблемы наспявалі доўга. Гэта і няўдалыя фінансавыя ўкладанні, і стратэгія развіцця бізнесу — ён рос у іх вельмі хутка, і не кожная кампанія пры такім вялікім росце здольная справіцца. Таму, вядома, вельмі важна мець кваліфікаваны персанал, які можа кіраваць маштабаваннем гандлёвай сеткі, не ствараючы фінансавых праблем і іншых пытанняў», — сказаў Аляксей Багданаў.

Паводле яго слоў, праблемы гандлёвай сеткі не ўдалося вырашыць ніякімі інструментамі, у тым ліку банкаўскімі крэдытамі і растэрміноўкамі плацяжоў. «Мы збіралі банкі, усіх удзельнікаў рынку, і вытворцаў, і пастаўшчыкоў, і прадстаўнікоў самой сеткі, размаўлялі з імі, але праблема не вырашылася. Гандлёвая сетка будзе ліквідавана, напэўна, гэта ўжо практычна адбылося. Але для спажыўцоў праблем не будзе, на месцах працуюць іх канкурэнты, якія актыўна закрываюць гэты сегмент рынку», — адзначыў міністр.

**Сяргей КУРКАЧ.**

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### У Кітаі назвалі ЗША імперыяй хлусні



Злучаныя Штаты ператварыліся ў імперыю хлусні, бо рэгулярна выкарыстоўваюць дэзынфармацыю для дасягнення сваіх карыслівых мэт. Аб гэтым заявіў на брыфінгу афіцыйны прадстаўнік Мінабароны Кітая Чжан Сяаган, каментуючы новую дактрыну Корпуса марской пяхоты ЗША па маніпуляванні інфармацыяй, паведаміла ТАСС. «Падманныя дзеянні робіцца ЗША не толькі ў ваеннай сферы, падман фактычна пракраўся ім у касцявы мозг», — сказаў Чжан Сяаган. Паводле яго слоў, на рахунку ЗША, у прыватнасці, «Аперацыя перасмешнік», якая праводзіцца падчас халоднай вайны для подкупу СМІ і маніпулявання грамадскай думкай. Чжан Сяаган нагадаў, што ЗША прадэманстравалі ў Савеце Бяспекі ААН «пральны парашок» у якасці доказу наяўнасці ў Ірака зброі масавага знішчэння, а таксама выкарыстоўвалі атрады «Белых касак» для фальсіфікацыі сведчанняў бамбёжак і хімічных атак, нібыта ўчыненых урадавымі войскамі Сірыі. Чжан Сяаган заявіў, што ЗША ачарнялі Кітай з-за яго палітыкі ў Сіньцзян-Уйгурскім аўтаномным раёне, а таксама распаўсюджвалі фэйкі аб кітайскіх вакцынах на Філіпінах і ў іншых краінах. Ён заклікаў ЗША спыніць распаўсюджваць ілжывую інфармацыю і збіваць свет з панталыку сваёй хлуснёй.

### Германія плануе нарасціць штогадовыя выдаткі на абарону да 80 мільярдаў еўра



Канцлер ФРГ Олаф Шольц заявіў, што ўрад збіраецца павялічыць штогадовыя выдаткі на абарону з 2028 года да 80 мільярдаў еўра, паведамілі заходнія СМІ. Шольц нагадаў, што ў 2017-м, да таго як ён у 2018 годзе стаў міністрам фінансаў Германіі, выдаткі складалі 37 мільярдаў еўра. Цяпер гэты артыкул расходаў падвоіўся — да 76 мільярдаў еўра ў год, і канцлер падкрэсліў, што такое павышэнне затрат на патрэбы абароны за такі кароткі час з'яўляецца «выдатным дасягненнем». Ён запэўніў, што цяпер Берлін будзе рэгулярна выдаткоўваць два працэнты ад ВУП на абарону, як таго патрабуюць крытэрыі НАТА.

### ААН заклікала выдзеліць сродкі для тэрміновай дапамогі пацярпелай ад засухі Малаві



ААН і яе партнёры выступілі з заклікам аб тэрміновым выдзяленні больш як 136 мільёнаў долараў ЗША для аказання дапамогі людзям, якія пацярпелі ад разбуральнай засухі ў Малаві. Пра гэта заявіў афіцыйны прадстаўнік генеральнага сакратара ААН Стэфан Дзюжарык, паведаміла «Сіньхуа». Паводле яго слоў, сродкі будуць выкарыстаны для аказання жыццёва важнай дапамогі 3,8 мільёна чалавек, якіх закранула разбуральная засуха. Малаві, краіна ў паўднёва-ўсходняй частцы Афрыкі, якая не мае выхаду да мора, абвясціла стан бедства ў сакавіку з-за працяглай засухі, якая пашкодзіла ўраджай. Чакаецца, што 5,7 мільёна чалавек — больш за чвэрць насельніцтва Малаві — сутыкнуцца з вострым недахопам харчавання.

На кантролі

# ПАДСТАВІЦЬ ПЛЯЧО Ў ГАРАЧУЮ ПАРУ

**З ходам уборачнай кампаніі на Гомельшчыне азнаёміўся ўпаўнаважаны прадстаўнік кіраўніка дзяржавы па Гомельскай вобласці — кіраўнік спраў Прэзідэнта Юрый НАЗАРАЎ.**



Нарада па тэмпах жніва ў рэгіёне прайшла на базе Петрыкаўскага райвыканкама. У ёй узялі ўдзел **памочнік Прэзідэнта — інспектар па Гомельскай вобласці Юрый ГОРЛАЎ і першы намеснік старшыні Гомельскага аблвыканкама Дзмітрый ПЕТРАЖЫЦКІ.** Па відэасувязі да правядзення нарады далучыліся **старшыня Гомельскага аблвыканкама Іван КРУПКО** і кіраўнікі райвыканкамаў.

На Гомельшчыне ў цэлым аграрыям неабходна ўбраць з палёў 364 тысячы гектараў збожжавых каласавых культур. На раніцу 25 ліпеня ў вобласці ўжо ўбрана звыш 60 % плошчаў. Штодня аграрыі ўбіраюць каля 12 тысяч гектараў. Найбольш высокія тэмпы жніва паказвае Жыткавіцкі раён: на гэтым тыдні, калі не падвядзе надвор'е, выйдуць на фінішную прамую. У тройцы лідараў па тэмпах уборачнай таксама гаспадаркі Добрушскага і Хойніцкага раёнаў.

— Максімум 12 пагодлівых дзён — і плануем завяршыць уборку, — абазначыў тэрмін па збожжавых каласавых першы намеснік старшыні Гомельскага аблвыканкама Дзмітрый Петражыцкі.

Паралельна ў рэгіёне працягваецца ўборка саломы, нарыхтоўка кармоў, а таксама ідзе падрыхтоўка да сяўбы азімага рапсу. Пад гэту культуру ўвосень на Гомельшчыне плануецца адвесці не менш за 70 тысяч гектараў. Сяўбу планующа распачаць 1 жніўня, завяршыць — 25 жніўня.

— Рапс — прыбытковая культура. Неабходна вытрымаць аптымальныя тэрміны і тэхналогіі. Кожны павінен разумець — цяпер закладваем ураджай наступнага года, — нацэліў прадстаўнік кіраўніка дзяржавы па Гомельскай вобласці — кіраўнік спраў Прэзідэнта Юрый Назараў.

Што датычыцца ўборачнай, ён пацікавіўся, ці дастаткова ў гаспадарках рэгіёна працоўных і тэхнічных рэсурсаў. Як было адзначана, сельгасарганізацыі вобласці цалкам забяспечаны механізатарамі і тэхнікай. Ва ўборачнай кампаніі на Гомельшчыне задзейнічана звыш тысячы камбайнаў, больш як 900 адзінак тэхнікі — на адвозцы збожжа.



Забяспечыць амаль 16 тысяч тон збожжа ў лік дзяржзаказу — такая задача пастаўлена перад аграрыямі рэгіёна. Справіцца з ёй плануюць да 15 жніўня.

Прадстаўнік кіраўніка дзяржавы па Гомельскай вобласці — кіраўнік спраў Прэзідэнта падчас работы ў рэгіёне наведаў сельгаспрадпрыемства «Палессе-Аграінвест» Петрыкаўскага раёна. Юрый Назараў ацаніў, як наладжаны працэс дапрацоўкі збожжавых на зернетоку, як вядзецца нарыхтоўка травяністых кармоў на зарэчнай зоне на тэрыторыі гаспадаркі.

— Уборка збожжавых пераваліла экватар. На жаль, ураджайнасці хацелася б лепшай. Вясной і мінулай восенню зрабілі ўсё неабходнае, але свае карэктывы ўносіць надвор'е. Між тым у вобласці сітуацыя пад кантролем, — у размове з журналістамі ў цэлым ацаніў уборачную кампанію ў рэгіёне Юрый Назараў. — Падчас нарады зрабілі значны акцэнт на падрыхтоўцы да азімай сяўбы, і, у прыватнасці, рапсу. Губернатар і першы намеснік паставілі задачу кіраўніцтву раёнаў завяршыць сяўбу азімага рапсу 25 жніўня. Бо гэта для нас вельмі выгадная культура. А тут найперш важна тэхналогія яе вырошчвання, бо культура капрызная, і калі не зрабіць усё, што патрэбна, аддачы не будзе.

Юрый Назараў звярнуў увагу, што важны комплексны падыход.

— Разбіраліся па кожнай касці людзей, якіх неабходна дадаткова прыцягнуць. Бо, здараецца, калі дэфіцыт кадраў, неабходна рашэнне пытанняў. Тут міністэрства абароны дапамагае, падстаўляе плячо. Як сёння праінфармавалі, звыш 100 чалавек прыбываюць цяпер у гаспадаркі з тэхнікай ці толькі механізатары. Таму гэты дэфіцыт таксама ўстараняецца, — рэзюмаваў Юрый Назараў.

**Наталля КАПРЫЛЕНКА,**
**фота газеты**
**«Петрыкаўскія навіны».**

# Меню для механізатара

*(Заканчэнне.*
*Пачатак на 1-й стар.)*

Чытаю меню, і апетыт прачынаецца. Кожны дзень новыя стравы. У пятніцу быў расольнік са смятанай, салата з памідораў, капусты і салодкага перцу, каўбаса смажаная па-нясвіжску, каша з проса. Падчас жніва выхадных не бывае, у тым ліку і для кухараў. Меню суботняга дня: суп бульбяны з просам, каша рысавая, тэфтэлі, салата з памідораў і агуркоў, кампот. Абед на палеткі падвозяць да 12.00, а вячэру — каля 17.00. Меню вячэры таксама разнастайнае.

— Наша меню ўзгодненае з санстанцыяй, кожны дзень усё рознае: суп, каша, мясное, — удакладняе Алеся. — Паўтораў на тыдні практычна не бывае.

Спецыяльна для механізатараў прадугледжана каструля на 25 літраў для супу і яшчэ адна на 19 літраў для кашы. Мяса гатавац загадчыца кавярні любіць у духавой шафе, яно тады больш сочнае атрымліваецца — як з печкі. І больш карыснае для здароўя. На абед на аднаго работніка таго ж мяса прыходзіцца 150-200 грамаў у залежнасці ад яго разнавіднасці. Рыбы ідзе менш, курыцы — больш. Шніцэлі, катлеты дамашнія, гуляш — формы на розны густ.

— Гатаваць абавязкова трэба з добрым настроем, — дзеліцца сакрэтамі майстэрства спецыяліст. — Калі не з той нагі ўстаў, лепш крыху пачакаць, супакоіцца. Інакш або падгарыць нешта, або смак будзе не тым. Затое калі на сэрцы лёгка, то і абед будзе не толькі смачны, але і карысны.

Працаваць сёння на палетках прыходзіцца шмат, сто патоў за дзень сыдзе, таму і пад'есці трэба добра, каб падмацавацца. Кухары гатуюць з улікам гэтага. Порцыя супу на аднаго чалавека — паўлітра, кашы — 300 грамаў, мяснога — 150-200 грамаў, салаты — 100 грамаў, хлеба пшанічнага і жытняга — па 120 грамаў, кампот — 300 грамаў. Адходаў няма. Таму што ўсё смачнае.

— Я вельмі люблю сваю справу, гэта маё захапленне, — смяецца Алеся. — З дзяцінства любіла гатаваць, потым паступіла ў Магілёўскі тэхналагічны тэхнікум (цяпер Магілёўскі дзяржаўны тэхналагічны каледж). Для вяселляў гатую, юбілеяў. Пакрыўджаных няма. У мяне самы высокі разрад кухара, хацелася б атрымаць яшчэ больш вышэйшы — майстра. Не люблю гатаваць строга па рэцэптуры, мне падабаецца знаходзіць новыя смакавыя адценні. Мае бабуля і маці спецыяльна для мяне вырошчваюць зеляніну, якую я дадаю ў стравы.

Суразмоўніца адсочвае, каб у полі былі створаны ўмовы не горшыя, чым у кавярні. Разам са стравамі ў «ГАЗель» загружаюцца пераносны столік, крэслы. Ежа перавозіцца ў спецыяльных тэрмасах, а талеркі — металічныя, яны больш экалагічныя. Іх можна апрацаваць у духавой шафе.

Вадзіцель МАЗа Яўген Нямыцька адзін з маладых у гаспадарцы, яму 32 гады. Сваю работу любіць і робіць усё для таго, каб дасягнуць высокіх вынікаў. У дзень на перавозцы збожжа намотвае 150-160 кіламетраў, часам лічба да 370 кіламетраў даходзіць. Работа на палетках чаргуецца з камандзіроўкамі, напрыклад, трэба па насенне з'ездзіць або яшчэ якую іншую важную справу выканаць.

Дома Яўгена чакаюць жонка і двое дзетак. Прызнаецца, што гатуе жонка адменна. Але на работу «тармазкі» ён не бярэ. Стравы з калгаснай кавярні вельмі смачныя і каларыйныя. Асабліва падабаюцца супы. І ўсё астатняе з адзнакай плюс — грэчка, макарона, катлеты, гуляш, плоў.



За тым, каб калектыў быў накормлены і працаздольны, сочыць і **старшыня прафкама гаспадаркі Наталля КАРАЛЁК**, яна ж намеснік галоўнага бухгалтара.

— Стараемся нашых работнікаў падбадзёрыць, — кажа яна. — Да механізатараў выязджаем у поле, найлепшым уручаем заахвочвальныя падарункі. Што датычыцца абедаў, то для нашых работнікаў яны каштуюць усяго 20 % ад поўнага кошту — рубель з капейкамі. Акрамя абедаў і вячэр падвозім таксама мінералку. Дапамагаем чым можам і ў астатнім. Пасля нядаўняга ўрагану ўсім дапамаглі аднавіць пашкоджаныя дахі дамоў.

У склад «Нясята-Агра» ўваходзіць некалькі населеных пунктаў, у пастаяннай працы задзейнічаны 79 чалавек. Перамяшчацца па тэрыторыі гаспадаркі без машыны складана. Але карэспандэнту «Звязды» дапамог **старшыня Нясяцкага сельсавета Сяргей ПЯТРОЎ**, дарэчы, таксама чалавек вельмі дасведчаны ў сельскагаспадарчых справах. Раней працаваў галоўным заатэхнікам у яшчэ адной аграгаспадарцы раёна — «Саўгас «Дабраволец». Прызнаецца, што палявая кухня падчас пасяўной і ўборкі гарантавана выручае, заўсёды работнікі накормленыя і з настроем. Ніхто ад працы надоўга не адрываецца. Летам кожная хвіліна дарагая. Людзі занятыя з раніцы да позняга вечара.

— Карміць людзей у полі — традыцыя даўняя, — кажа старшыня сельсавета. — Памятаю, школьнікам прыбягаў да бацькі ў поле, ён яшчэ і катлету мне дасць, каб перакусіў. Пытанне важнае і цяпер, у райвыканкаме пастаянна звяртаюць увагу на тым, каб месцы гатоўкі ежы былі максімальна набліжаны да палёў, дзе працуюць людзі. Гэта на вельмі жорсткім кантролі. Наогул, на абеды яшчэ ніхто не скардзіўся. У іншых такога і дома няма. А тут — і першае, і другое, і мяса, і кампот. Ураджай залежыць ад надвор'я, а якасць яго ўборкі ад працаздольнасці людзей. Сыты заўсёды зробіць больш, чым галодны.

Па суседстве з палямі аграгаспадаркі «Нясята-Агра» шчыруюць работнікі СПК «Калгас імя Леніна», прыбіраюць ячмень. Іх палявая кухня толькі што з'ехала, пяць хвілін на перакур і зноў за штурвал. «Сёння ў нас была бульба з мясам, — расказваюць механізатары. — А на першае — расольнік. Потым яшчэ вячэру падвязуць».

Знаёмлюся з самым маладым удзельнікам жніва — памочнікам камбайнера Мікітам Ерамеевым, яму нядаўна споўнілася 18 гадоў. Сам ён баброўчанін, а вучыцца ў Клічаўскім аграрна-тэхнічным каледжы, атрымлівае спецыяльнасць



Кафе «вкус дома»
03 июня 2024

Обед
Щи из свежей капусты с картофелем со сметаной
Каша вязкая гречневая
колбаса жареная по несвежски
Салат из белокоч капусты (с морковью)
Компот из кураги
Хлеб пшеничный
Хлеб ржаной

Количество 5
Общая сумма
Наценка

Заведующий столовой
Бухгалтер

«Тэхнік-механік». Налета ўжо будзе дыпламаваны спецыяліст. Гэта яго першае жніво. Расказвае, што як толькі правы трактарыста атрымаў, вырашыў паспрабаваць зарабіць першыя грошы. Марыць накапіць на асабістую машыну.

Камбайн «Палессе», на якім ён працуе, — адна з апошніх распрацовак. У гаспадарцы ён год. У кабіне сапраўды вельмі камфортна: аглядная кабіна, працуе кандыцыянер, некалькі электронных дысплеяў. Ёсць халадзільнік і магнітола — можна музыку або навіны паслухаць. З веданнем справы расказвае пра электронную начынку машыны.

У абавязкі Мікіты ўваходзіць адсочваць стан поля, каб у жнярку не трапілі пабочныя рэчы, тыя ж камяні; старэйшы калега дазваляе праудуць камбайн, зрабіць іншыя нейкія маніпуляцыі. Адным словам, давярае.

— Сельская гаспадарка мне падабаецца, таму і вучыцца пайшоў у аграрны каледж, — прызнаецца малады чалавек. — Працуеш, а вакол прырода. Не рэдкасць, калі буслы каля нас палююць на дробную жыўнасць. А сёння бачыў, як трус прабягаў. І тэхніка вельмі камфортная. І працуем, а стомленасці няма. І кормяць вельмі добра.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**
**Фота аўтара і з архіва супрацоўнікаў ААТ «Нясята-Агра».**
*Клічаўскі раён.*

# ПРАЦАВАЛІ БЕЗ ПЕРАПЫНКУ І ДНЁМ, І НОЧЧУ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

15 ліпеня ў гарадскім пасёлку Халопенічы ў выніку праходжання навальнічнага фронту адбылося падзенне каля 40 дрэў, пашкоджаны агароджы, вокны, дахі 126 жылых дамоў у саміх Халопенічах і 5 дамоў у суседніх вёсках, а таксама 9 адміністрацыйных і сацыяльных будынкаў. Мясцовыя ратавальнікі ў ліку першых прыйшлі людзям на дапамогу.

Зараз работы вядуць і супрацоўнікі Крупскага лясгаса. **Намеснік кіраўніка Крупскага лясгаса па ідэалагічнай рабоце Наталля КАМОВІЧ** паведаміла: «15 і 16 ліпеня асноўны акцэнт у работах мы зрабілі на расчыстку дарог ад паваленых дрэў. 15 ліпеня максімальна нашы сілы былі задзейнічаны ў гарадскім пасёлку Халопенічы. Затым наступствы стыхіі сталі ўстараняць у вёсцы Дубы Акцябрскага сельсавета. Там таксама бушавала бура».

Гарадскі пасёлак Халопенічы даволі вялікі. У ім налічваецца 28 вуліц, 592 домаўладанні, пражывае больш за 1300 чалавек.

«15 ліпеня прыкладна ў 15.50 над Халопенічамі сышліся дзве хмары. Пачаўся моцны вецер, лівень і град. Бачнасць — не далей выцягнутай рукі. Праз 15-20 хвілін вецер супакоіўся, бачнасць аднавілася. Мы выйшлі на вуліцу Савецкую і замерлі, убачанае тут выклікала ў нас шок... Уся вуліца была завалена векавымі ліпамі і іншымі дрэвамі. Ды так, што немагчыма было ні прайсці, ні праехаць! Моцныя дрэвы разам з каранямі ляжалі на дарогах, на платах, дахах... Акрамя жылых дамоў поўнасцю або часткова былі разбураны розныя гаспадарчыя пабудовы: гаражы, хлявы, лазні, цяпліцы. Мы вялі ўлік менавіта па жылых дамах для таго, каб аказаць экстранную дапамогу, хутка адрэагаваць і накрыць дахі. Людзям заліло маёмасць: нацяжныя столі, паркеты, ламінаты, мэблю, тэлевізары, бытавую тэхніку — дождж ліў як з вядра», — успамінае **старшыня Халопеніцкага сельскага выканаўчага камітэта Лідзія БАЧЫШЧАВА.**



Яна расказала пра зладжаную работу супрацоўнікаў РАНС. «Іх участак размяшчаецца ў нашым гарадскім пасёлку, таму яны імгненна зрэагавалі. Ратавальнікі расчышчалі вуліцы і падворкі ад паваленых дрэў. Далей падключыліся работнікі РЭС. На працягу першых 20 хвілін пасля ўрагану ўжо ўсе падраздзяленні былі на работах па ліквідацыі наступстваў. Праз 30-40 хвілін па вуліцах ужо ездзіў транспарт», — адзначае Лідзія Бачышчава.

Разам з ёй мы адпраўляемся на вуліцу Савецкую. «Вялікую дапамогу ў ліквідацыі наступстваў непагадзі аказалі Мінскі аблвыканкам і Крупскі райвыканкам. Таксама да работ далучыліся ўсе раённыя арганізацыі, незалежна ад формы ўласнасці і занятасці, а таксама Бярэзінскі і Барысаўскі раёны. Калі я пачну пералічваць іх усіх, ніякіх газетных лістоў не хопіць... Прадпрыемствы выдзялялі людзей, бензапілы, маніпулятары, транспарт. І вось зараз прайшоў тыдзень пасля стыхіі, і вы бачыце чыстыя вуліцы, аднаўленыя жылыя дамы. Зладжана працавалі абсалютна ўсе. Акрамя таго, у ліквідацыі наступстваў непагадзі актыўны ўдзел прымаў дэпутацкі корпус усіх узроўняў: абласнога, раённага, сельскага», — дадала старшыня сельвыканкама.

Яна паведаміла, што ўвечары 17 ліпеня ўсе дахі жылых дамоў былі накрытыя. «Нам даставілі будаўнічыя матэрыялы: 1000 лістоў шыферу, 100 кілаграмаў цвікоў, піламатэрыялаў было так шмат, што я нават не магу назваць дакладную лічбу», — сказала Лідзія Іванаўна.

Жыхары гарадскога пасёлка дзякуюць за аператыўную і якасную работу. Лідзія Бачышчава дадае, што цягам чатырох першых дзён ліквідацыі надзвычайнай сітуацыі Крупскім раённым выканаўчым камітэтам для ліквідатараў было арганізавана харчаванне. Гэта дазволіла людзям працаваць круглыя суткі.



**15 ліпеня ў гарадскім пасёлку Халопенічы ў выніку праходжання навальнічнага фронту адбылося падзенне каля 40 дрэў, пашкоджаны агароджы, вокны, дахі 126 жылых дамоў у саміх Халопенічах і 5 дамоў у суседніх вёсках, а таксама 9 адміністрацыйных і сацыяльных будынкаў. Мясцовыя ратавальнікі ў ліку першых прыйшлі людзям на дапамогу.**

Лідзія Іванаўна разам з рабочымі брыгадамі аб'язджае жылыя дамы, кіруе аднаўленчымі работамі. «Мы праязджаем па ўсіх вуліцах нашага гарадскога пасёлка. Можа, у кагосьці нешта не дарабілі, магчыма, дзесьці кавалачак шыферу адламаны. Усе нюансы будзем ліквідаваць. Трэба ўстараніць усе недахопы, каб прадухіліць падобную сітуацыю», — падкрэсліла яна.



З-за непагадзі пацярпелі лініі электраперадачы. Іх завеліла дрэвамі. «У выніку людзі засталіся без электрычнасці. Але ў той жа вечар 15 ліпеня было адноўлена электрасілкаванне, устаноўлены новыя слупы і правады. Ужо ў 23.00 увесь гарадскі пасёлак быў падключаны да электраэнергіі», — дадае старшыня сельвыканкама.

## «УСЁ ПАЧАЛО ЛЯЦЕЦЬ»

Мясцовы жыхар **Леанід КАМАНДЗІРЧЫК** распавядае, як у яго дом спачатку прыйшла бяда, а потым — дапамога: «На працягу трох-чатырох хвілін ішла навальнічная хмара ў нашым напрамку, падняўся ўраган. Я гляджу ў акно, бачу, як паляцеў шыфер. Усё пачало ляцець. Быў вельмі буйны град, але ён хутка скончыўся і перайшоў на дождж, які ліў сцяной. У нас выцяснула франтон, у дом праз столь пацякла вада... Пасля таго, як усё скончылася, я выйшаў з хаты і бачу: дах сарваны, усё вакол пабіта кавалкамі шыферу. Чвэрць ліста загнала ў зямлю... Пасля прыехалі мае сыны, накрылі дом брызентам, а на наступную раніцу да нас прыйшла дапамога. Нам прывезлі дошкі, цвікі і ўсе неабходныя матэрыялы, за што вялікі дзякуй. Таксама да нас прыслалі брыгаду прадпрыемства «НеАлТом». Яны аператыўна дапамаглі, усё зрабілі на вышэйшым узроўні, грэх скардзіцца».



**Начальнік цэха вытворчасці ПВУП «НеАлТом» Андрэй АЛЕКСІЕВІЧ** распавёў, што работы па аднаўленні дахаў выконвала адна брыгада з пяці чалавек: «Таксама мы займаліся прыборкай паваленых дрэў у мясцовым парку каля бальніцы. У работах выкарыстоўвалі два маніпулятары, спецыяльную тэхніку і трактар «Беларус». Цяпер аднаўленчыя работы працягваюцца».

Андрэй Алексіевіч паведаміў, што ўсе дахі жылых дамоў адноўлены, засталіся нежылыя памяшканні, заканчваюцца работы па ачыстцы вуліц. «У доме Леаніда Камандзірчыка дах быў пашкоджаны адразу з абодвух бакоў. Мы дадалі лачанне, паклалі 40 лістоў шыферу. Франтон быў разбураны, таму яго прыйшлося перарабляць. Умацавалі каркас», — сказаў ён.

Жыхарка Халопенічаў **Тацццяна ТАРАСЕНКА** дапаўняе расказ аднавяскоўца: «Я збіралася выйсці на вуліцу, каб развесіць бялізну, але ўбачыла спачатку невялікую хмарку. Потым раптам пачаўся такі моцны град, якіх раней не бачыла. Выбегла на вуліцу, каб закрыць цяпліцу, гляджу, а ад яе ўжо нічога не засталося — ляжыць гармонікам... Тады забегла ў дом, каб сказаць сваякам, што з цяпліцай бяда, а там са столі вада капае... І я ўжо не ведала, што ратаваць. Мой маленькі ўнук вельмі спалохаўся, казаў: «Бабуля, дапамажы, мне страшна...»

Па словах Таццяны Мікалаеўны, вадой заліло ўсю залу. Ураган знёс палову даху, цалкам разбурыў хлеў, цяпліцу, выкарчаваў дрэвы. «Усёй сям'ёй дапазна прыбіралі ваду з падлогі, каб паспрабаваць яе выратаваць... Мы і не паспелі зразумець, што адбылося, бо надвор'е разбушавалася імгненна. Вокам не паспелі міргнуць — і зямля, і агароды ўжо былі перабітыя, абсыпаныя шыферам», — працягвае яна.

Супрацоўнікі МНС і мясцовае кіраўніцтва аднымі з першых прыехалі на дапамогу да пенсіянеркі. «На наступны дзень нам выдзелілі будаўнічыя матэрыялы, работы па аднаўленні дома праводзіў Крупскі лясгас, за што ім вялікі дзякуй. Яны з адказнасцю і разуменнем паставіліся да нашай праблемы. Вельмі радуе, што ў нас працуюць такія неабыякавыя людзі. З пяці гадзін раніцы яны крылі нам дах дома і хлева, зрабілі лачанне, франтон, шыфер — сапраўды каласальная праца. За двое сутак усе работы былі выкананы», — расказала мясцовая жыхарка.

У доме Таццяны Мікалаеўны прыйшлося цалкам мяняць дах. Пацярпелі і яе суседзі. «Многія засталіся ў літаральным сэнсе без даху над галавой, але ўсе нашы праблемы мясцовыя ўлады імкнуліся вырашыць аператыўна. І ў іх гэта выдатна атрымалася! Нам вельмі дапамаглі. Цяпер трэба будзе бяліць сцены, клеіць шпалеры, рамантаваць прыбіральню, ванную, але ўсё гэта будзем рабіць ужо сваімі сіламі. Дзі і нашы дзеці — надзейная апора і падтрымка. Галоўнае, што цяпер у нас ёсць дах над галавой», — падзялілася яна.

Таццяна Мікалаеўна вельмі шкадуе свае дрэвы, якія былі вырваныя з коранем. «Гэта шматгадовыя грушы, яблыні, вішні — усё вырвана, пашкоджана... Але галоўнае, што цяпер у нас ёсць дах над галавой, дай бог, каб такое больш не паўтарылася. Нягледзячы на стыхію, наша жыццё працягваецца. А дрэвы мы новыя пасадзім для нашых унукаў», — падагульніла яна.

Цяпер на вуліцах гарадскога пасёлка Халопенічы мясцовыя службы на вышыні абразаюць галінкі дрэў, размешчаныя каля ліній электраперадачы. «Мы ліквідуем наступствы ўрагану, прыбіраем дрэвы, якія трапілі на лініі электраперадачы і жылыя дамы. Працуем на вялікай вышыні, абразаем галінкі дрэў, акуратна здымаем іх па ўсім населеным пункце, каб не дапусціць падобнай праблемы ў будучыні», — расказвае **майстар Крупскага РЭС Уладзімір ШАЙТАНАЎ.**

15 ліпеня яго брыгада таксама была ў эпіцэнтры падзей. «Працавалі двое сутак без адпачынку: і днём, і ноччу. Людзям ужо далі святло, але многае яшчэ трэба зрабіць, каб тут жылося камфортна і бяспечна», — падсумаваў майстар.

**Данііл ХМЯЛЬНІЦКІ.**
**Фота Віктара ІВАНЧЫКАВА.**

На адной хвалі

# СТАРТ НОВЫХ МАГЧЫМАСЦЯЎ

**На афіцыйным сайце Белтэлерадыёкампаніі да 10 жніўня можна падаць заяўку на ўдзел у II Міжнародным тэлевізійным конкурсе дзіцячай аўтарскай песні «Наша пакаленне», фінал якога пройдзе ў Расіі.**




Прыняць удзел у творчым спаборніцтве і здабыць права прадстаўляць нашу краіну на конкурсе «Наша пакаленне» могуць юныя аўтары-выканаўцы, а таксама аўтарскія калектывы выканаўцаў (у складзе не больш за шэсць чалавек) ва ўзросце ад 9 да 15 гадоў.

Згодна з правіламі, заяўленая на конкурс кампазіцыя павінна быць аўтарства ўдзельніка (альбо ён павінен прымаць актыўны ўдзел у яе стварэнні). Варта адзначыць, што ў адборы могуць прымаць удзел толькі тыя песні, якія раней нідзе не выконваліся публічна. Строга рэгламентавана і працягласць трэкаў — яна не павінна перавышаць дзве з паловай альбо тры хвіліны.

Каб падаць заяўку, неабходна на афіцыяльным сайце медыяхолдынга www.tvr.by ў тэматычным раздзеле запоўніць анкету і дадаць да яе патрэбныя файлы. Заяўкі прымаюцца да 10 жніўня ўключна. Больш актуальную інфармацыю і падрабязнасці правядзення конкурсу можна знайсці на сайце Белтэлерадыёкампаніі, у эфіры «Беларусь 1» і каналаў Беларускага радыё, а таксама ў Telegram-каналах ATN_NEWS і «Радыё_1».

Пераможца, якога вызначаць члены прафесійнага журы, будзе прадстаўляць Беларусь на вялікай сцэне ў фінале II Міжнароднага тэлевізійнага конкурсу дзіцячай аўтарскай песні «Наша пакаленне» ў Казані. Спяшайцеся скарыстацца сваім шанцам заявіць пра сябе.

**Алена ДРАПКО.**

## ШАХМАТНЫ КЛУБ

Выпуск № 203

Сённяшняя задача належыць беларускаму складальніку Аляксандру Міхалапу ***(гл. дыяграму)***. Вайсковец па адукацыі, прадпрымальнік, ён захапіўся шахматнай кампазіцыяй яшчэ ў школьныя гады. Быў пераможцам і прызёрам чэмпіянатаў Беларусі па складанні і рашэнні задач. Нацыянальны майстар па кампазіцыі.




**Белыя:** Кра2, Фg6, Лh1, Лh7, Cg2, Kb1, пп. f4, g5 (8).

**Чорныя:** Крс2, Лf5, Kg7, пп. a3, d3, e6 (6).

Мат за 2 хады.

Дасылайце адказы на адрас рэдакцыі (вул. Б. Хмяльніцкага, 10а, 220013, г. Мінск, «Звязда») або на электронны адрас вядучага аддзела: vadim_ne67@mail.ru

* * *

У Магілёве прайшоў V Мемарыял трэнера Святаслава Казака. У «класічным» турніры (57 удзельнікаў, у тым ліку 1 міжнародны майстар, 2 майстры FIDE) перамог Канстанцін Куляшоў (Беларусь), а 2—5-е месцы занялі адпаведна (пры роўнай колькасці балаў) майстар FIDE з Расіі Валянцін Уласаў, беларускія шахматысты Аляксандр Гвоздзь, Раман Леінаў і Ігнат Яхант.

У хуткіх шахматах (77 гульцоў, у тым ліку 1 міжнародны майстар і 3 майстры FIDE) прызавую тройку склалі майстар FIDE Уладзіслаў Каташук, Канстанцін Куляшоў і міжнародны майстар Пётр Карзубаў (усе — Беларусь).

**Условия:** аукцион проводится при наличии двух и более участников. Победитель аукциона обязан в течение 10 рабочих дней после подписания протокола о результатах проведения аукциона внести плату за земельный участок и возместить расходы, связанные с организацией и проведением аукциона.

**Ориентировочная сумма затрат на строительство, в том числе проектирование объектов распределительной, инженерной и транспортной инфраструктуры к земельному участку, подлежит возмещению в порядке и случаях, предусмотренных постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 01.04.2014 № 298 «Об утверждении Положения о порядке возмещения лицом, которому предоставлен земельный участок, затрат на строительство, в том числе проектирование, объектов распределительной инженерной и транспортной инфраструктуры к такому земельному участку», в соответствии с Указом Президента Республики Беларусь от 07.02.2006 № 72 «О мерах по государственному регулированию отношений при размещении и организации строительства жилых домов, объектов инженерной, транспортной и социальной инфраструктуры», составляет:**

1. аг. Камено, ул. Поселковая, д. 24А составляет ориентировочно – **5769,15** бел. руб. (электроснабжение – 1949,85 бел. руб., водоснабжение – 318,90 бел. руб., транспортная инфраструктура – 3500,40 бел. руб.);
2. д. Фильяново, д. 26А составляет ориентировочно – **4885,35** бел. руб. (электроснабжение – 4885,30 руб.);
3. д. Чмелевичи, д. 14А, составляет ориентировочно – **5094,82** бел. руб. (электроснабжение – 4885,35 бел. руб., водоснабжение – 209,47 бел. руб.).

## ИНФОРМАЦИОННОЕ СООБЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА по продаже гражданам Республики Беларусь в частную собственность земельного участка для ведения личного подсобного хозяйства в д. Великое Залужье, ул. Садовая, 9А Озерицко-Слободского сельсовета Смолевичского района Минской области

***Организатор аукциона: Озерицко-Слободской сельский исполнительный комитет, 222215, аг. Слобода, ул.*** *Красногвардейская, д. 27, Смолевичский район, Минская область.*

| № лота | Адрес земельного участка | Кадастровый номер | Площадь (га) | Целевое назначение | Начальная цена земельного участка (бел. руб.) |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | д. Великое Залужье, ул. Садовая, 9А | 624883001601000114 | 0,05 | Для ведения личного подсобного хозяйства (10200 – земельный участок для ведения личного подсобного хозяйства) | 4000 |

Аукцион состоится **28 августа 2024 г. в 15.00** в Озерицко-Слободском сельском исполнительном комитете по адресу: аг. Слобода, ул. Красногвардейская, 27, Смолевичский район, Минская область, зал заседаний **(тел.: 801776, 50066).**

Извещения о проведении аукциона размещены на сайтах: Государственного комитета по имуществу: **https://au.nca.by,** Минского областного исполнительного комитета: **https://info@minsk-region.gov.by,** Смолевичского райисполкома: **isp@smolevichi.gov.by.**

УНП 600046563

### ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона/ оператор** | ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 4б. www.ipmtorgi.by |
| **Продавец** | Частное предприятие «ДисХол и К», Минская обл., Борисовский р-н, Веселово, ул. Центральная, д. 11 |

| Предмет электронных торгов | Начальная цена с НДС 20 %, бел. руб. |
|---|---|
| **Лот № 1 – буфет-столовая** (здание специализированное для общественного питания), инв. номер 610/С-31088, общей площадью 225,5 кв. м, по адресу: Минская обл., Борисовский р-н, г. Борисов, ул. III Интернационала, 199А. Составные части и принадлежности: покрытие, забор | **240 000,00** |
| **Лот № 2 – производственный корпус ТР автомобилей** (здание неустановленного назначения), инв. номер 610/С-46490, общей площадью 3999,2 кв. м, по адресу: Минская обл., Борисовский р-н, г. Борисов, ул. III Интернационала, 199Б. Составные части и принадлежности: навес | **1 400 000,00** |
| **Лот № 3 – административно-бытовое здание** (здание неустановленного назначения), инв. номер 610/С-46492, общей площадью 288,7 кв. м, по адресу: Минская обл., Борисовский р-н, г. Борисов, ул. III интернационала, д.199 | **240 000,00** |
| **Лот № 4 – навес для доработки овощей** (сооружение специализированное сельскохозяйственного назначения), инв. номер 610/С-60936, наружная площадь (площадь застройки) – 1537 кв. м, по адресу: Минская обл., Борисовский р-н, Пригородный с/с, в районе д. Бытча | **189 816,00** |

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета электронных торгов перечисляется в белорусских рублях на счет BY92BELB301200483 5008022600 в ОАО «Банк БелВЭБ», г. Минск, ул. Мясникова, 32; БИК BELBBY2X; ОКПО 378531865000, получатель платежа – ООО «ИПМ-Консалт оценка», УНП 191224638

**Срок подписания договора купли-продажи: 10 (десять) рабочих дней** со дня завершения электронных торгов

**Условия оплаты предмета электронных торгов**

Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты предмета аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение 30 (тридцати) календарных дней после заключения договора купли-продажи

Порядок проведения электронных торгов, критерии выявления победителя торгов, порядок оформления участия в торгах и результатов торгов установлены регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: **www.ipmtorgi.by**

Победитель электронных торгов либо единственный участник электронных торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета электронных торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить вознаграждение **4 %** (по лотам №№ 1, 3, 4) и **2 %** (по лоту № 2) от цены продажи лота в течение 3 рабочих дней после проведения электронных торгов

Организатор электронных торгов имеет право снять предмет аукциона с электронных торгов в любое время до момента определения победителя электронных торгов без объяснения причин снятия

Предыдущее извещение опубликовано в газета «Звязда» от 02.07.2024 г.

**Дата и время начала и окончания электронных торгов: 20.08.2024 г. с 11.00 до 13.00.**
Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов

**Дата и время окончания приема заявок:** заявки на участие в электронных торгах принимаются по **19.08.2024 г.** до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: www.ipmtorgi.by

| | |
|---|---|
| **Контактные данные** | **Тел.: +375 (17) 373 21 33; +375 (44) 704-92-06. E-mail: info@ipmtorgi.by** |

### ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона/ оператор** | ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 5, www.ipmtorgi.by |
| **Продавец** | Производственное унитарное предприятие «Пищевой комбинат Белкоопсоюза», г. Минск, пр-т Партизанский, 168 |
| **Предмет электронных торгов:** объекты недвижимого имущества в количестве 30 ед. и иное имущество, реализуемые одним лотом по адресу: **г. Минск, пр-т Партизанский, 168.** Подробный состав имущества размещен на электронной торговой площадке «ИПМ-Торги» (**www.ipmtorgi.by**) | **Начальная цена (с НДС) – 19 800 000,00 бел. руб.** Шаг торгов – 5 % от начальной цены |

***Сведения о земельном участке с кадастровым № 500000000002005960:*** предоставлен продавцу на праве общего долевого постоянного пользования для эксплуатации и обслуживания зданий и сооружений комбината общ. площадью 12,4629 га (доля продавца: 63587/128660).

***Обременения по объектам недвижимого имущества:*** ипотека в ОАО «Сберегательный банк «Беларусбанк», аренда, запрет на отчуждение, который будет снят после оплаты Покупателем приобретенного предмета электронных торгов. Дополнительная информация у Продавца.

***Обременение по земельному участку:*** сервитут

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета электронных торгов перечисляется в белорусских рублях на счет BY92BELB3012 0048350080226000 в ОАО «Банк БелВЭБ», г. Минск, ул. Мясникова, 32; БИК BELBBY2X; получатель платежа – ООО «ИПМ-Консалт оценка», УНП 191224638

**Срок подписания договора купли-продажи: 15 (пятнадцать) рабочих дней** со дня завершения электронных торгов

**Условия оплаты предмета электронных торгов:** если между продавцом и покупателем в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты предмета электронных торгов, такая оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати) календарных дней** после заключения договора купли-продажи

Электронные торги проводятся в соответствии с регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by.
Ответственность участника аукциона, его права и обязанности, штрафные санкции прописаны в соглашении о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона.
Данное соглашение является договором присоединения и размещается на странице лота во вкладке «Документы» по адресу: **www.ipmtorgi.by**. Страница лота по указанному адресу содержит также информацию о типе торгов и общих правилах их проведения. Победителем аукциона признается участник, предложивший максимальную цену

Победитель электронных торгов либо единственный участник электронных торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета электронных торгов на 5 %, обязан возместить затраты организатору торгов на их проведение, а также оплатить вознаграждение **1 (один) %** от цены продажи лота в течение 3 рабочих дней после проведения электронных торгов

Организатор электронных торгов имеет право снять предмет аукциона с электронных торгов в любое время до момента определения победителя электронных торгов без объяснения причин снятия

**Дата и время начала и окончания электронных торгов: 26.08.2024 г. с 11.00 до 13.00.**
Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов

**Дата и время окончания приема заявок:**
заявки на участие в электронных торгах принимаются по **23.08.2024 г.** до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: www.ipmtorgi.by

| | |
|---|---|
| **Контактные данные** | **Тел.: +375 17-373-21-33; +375 (44) 704-92-06. E-mail: info@ipmtorgi.by** |

## РУП «ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ»

(Организатор электронных торгов, Оператор электронной торговой площадки) извещает о проведении повторных электронных торгов по продаже имущества, принадлежащего **ОАО «Недра Нежин»** (Продавец).

**Электронные торги состоятся 13.08.2024.**

**Лот № 1: Офисная мебель,** инвентарь в кол-ве 347 единиц (полный перечень представлен на электронной торговой площадке «GOSTORG»).
Начальная цена с НДС 20 % – 193 894,80 руб.
Задаток – 19 389,48 руб.

**Лот № 2: Автоматическая пожарная сигнализация,** оповещение о пожаре и управление эвакуацией (инв. № 365).
Начальная цена с НДС 20 % – 47 280,00 руб.
Задаток – 4 728,00 руб.

**Лот № 3, в составе:**
**1. Система видеонаблюдения** (инв. № 881);
**2. Система контроля и управления доступом** (инв. № 879);
**3. Локальная вычислительная сеть** (инв. № 878).
Начальная цена с НДС 20 % – 30 000,00 руб.
Задаток – 3 000,00 руб.

Место нахождения Лотов №№ 1 – 3: г. Минск, пл. Свободы, 17.

**Шаг электронных торгов** – 5 %.

Срок для подписания договора купли-продажи: 10 (десяти) рабочих дней со дня проведения электронных торгов (после предъявления Продавцу платежного документа, подтверждающего оплату вознаграждения Организатора электронных торгов).

Порядок проведения электронных торгов определен Регламентом электронной торговой площадки «GOSTORG» (далее – ЭТП).

Детальная информация об электронных торгах, в том числе об оформлении участия в них, условиях торгов размещена на ЭТП.

Задаток перечисляется на р/с BY85BAPB30127802900100000000 в ОАО «Белагропромбанк», BIC BAPBBY2X. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182. Окончание приема заявлений с прилагаемыми к ним документами и задатков: 08.08.2024 в 16.00.

**Организатор электронных торгов: 8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52, torgi@ino.by; электронный адрес ЭТП: gostorg.by**

УНП 190055182




## ПАМІЖ НАМІ, СУСЕДЗЯМІ

Што ні хата, то свой комін і свае парадкі. У Сцяпанавай — быў матрыярхат: гэта значыць, як жонка скажа, так і будзе. Муж нават рады. А што? Атрымаў загад — выканаў і галава не баліць. Але ж...

Не, не заўсяды як на Дзяды: здараецца на вяку і па спіне, і па баку. Сцёпа ўліп аднойчы — дзейнічаў на свой одум.

...Дуся яго ў тую нядзелю на базар паехала, яму загадала праз дзве гадзіны квактуху з гнязда ссадзіць і пакарміць.

— Пад ёй, — нагадала яна — чатырнаццаць куранят. Не дай бог не далічуся, як летась індыкоў, — галаву знясу.

Жонка сказала гэта спакойна, але муж пачырванеў. Быў за ім такі грэх: забыўся неяк варотцы зачыніць... Двух індыкоў ліса, напэўна, панесла.

Таму на гэты раз Сцёпа ўжо не вароніў — уважліва прасачыў за стрэлкамі гадзінніка, у патрэбны час спаднізу, у дзве рукі падхапіў квактуху — палічыў у гняздзе пушысцікаў і пахаладзеў: іх было... дзесяць!

— Лёня, што рабіць?! — кінуўся да сябра з пытаннем. (Не здагадаўся, бядак, што малыя маглі «завіснуць» у курыцы пад крыламі.)

— Ды не хвалюйся, — суцешыў той. — Я тваю бяду адной левай развяжу. Баба Соня — ты ж ведаеш — кожнае лета па паўсотні куранят купляе... «Свіснем» некалькі штук, — яна і не заўважыць.

...Што праўда, тое праўда: гэта гаспадыня куранят лічыла толькі ўвосень. А вось Сцёпава Дуся — адразу ж, як з базару прыехала.

— Тут жа 20?! Адкуль? — здзівілася яна.

Сцёпа трымаўся стойка:

— Ведаць не ведаю! Я іх наогул не лічыў... Квактуху пакарміў, як ты сказала, і ўсё.

...Да бабы Соні, ён праўда, потым схадзіў — павініўся, два мяшкі зерня завёз.

Яго многа ў свірне было, так што Дуся гэтай страты таксама не заўважыла.

**А. Навасельская,**
*Мінскі раён.*

## ПІВА ЗБЛІЖАЕ ЛЮДЗЕЙ, АЛЕ НЕ ЎСІХ

Недзе ў сярэдзіне 90-х гадоў здарылася ў мяне сустрэча, памяць пра якую жыве да сёння.

Трэба па парадку? Тады...

Настрой у той надвячорак у мяне быў харошы... Яшчэ лепшым зрабіць хацелася: гэта значыць, шліфануць свае 170 грамаў на брата добрым піўком!

Тут трэба зазначыць, што любая піўнушка ў той час (ды і нашмат раней) была мо адзіным месцам, дзе людзі пачуваліся роўнымі, дзе маглі з першымі сустрэчнымі шчыра пагаварыць пра палітыку, пра мастацтва, абмеркаваць жыццёвыя праблемы... Нехта ж нездарма пісаў, што «Ссорит нас водка, братцы, / Пиво сближает людей...»

І сапраўды, неяк раз, за куфлем пеннага, я міжволі «падслухаў» размову двух малады мужчын:

*«Кожны дзень мы п'ём літроўку*
*За здароўе Пеці Броўкі»,* — пачаў быў адзін.

*«За здароўе Броўкі Пеці*
*Мы прап'ём усё на свеце»,* — падхапіў другі.

А далей пачалася спрэчка пра аўтарства. Першы лічыў, што гэты вершык напісаў Караткевіч, каб такім вось арыгінальным чынам апраўдаць свой грэх злоўжывання, другі сцвярджаў, што сам Гілевіч, бо надта ж складна атрымалася: пачуў і злёту запомніў!

Як аказалася — нават я.

...У той надвячорак людзей у піўной было мала: трое шумных распараных мужчын ды ў куце яшчэ два дзядзькі.

Выглядалі яны як звычайныя настаўнікі, піва закусвалі нейкай сушанай драбязой, але ж я прыгледзеўся і пазнаў... Рыгора Барадуліна і Генадзя Бураўкіна, якіх у тыя гады досыць часта паказвалі па тэлевізары. «Вядомыя паэты, — падумаў пра іх. — Не грэбуюць, бач, пралетарскай піўнушкай».

Мэтры, як выглядала, гаварылі пра нейкую публікацыю ў часопісе «Нёман».

Я дрэнна чуў іх вучоную дыскусію і амаль нічога не зразумеў, але ж расхрабрыўся і ўголас паўтарыў некалі пачутае:

*«Кожны дзень мы п'ём літроўку*
*За здароўе Пеці Броўкі...»*

Бураўкін, бачу, насцярожыўся: хто гэта «мы»? А Барадулін так прыязна ўсміхнуўся, што я асмялеў яшчэ болей — падумаў, а чаму б шаноўным паэтам не праставіць піва?!

З гэтай думкай я рушыў да стойкі буфета, замовіў, забраў, а стаў несці ў кут да століка і жахнуўся: «А што ж далей? Аб чым загаварыць, калі мая дасведчанасць у паэзіі «ў рамках» школьнай праграмы (Колас, Купала, Багдановіч... Ну Крапіва яшчэ)... Да таго ж у памяці ўсплыло сцвярджэнне знакамітага Казьмы Пруткова пра тое, што пахвала гэтак жа патрэбна таленту, як каніфоль — смычку віртуоза.

А што пахваліць у Бураўкіна, у Барадуліна? Іх жа ў школе не праходзілі.

Таму я, пачціва праставіўшы піва, падзякаваў гэтым шаноўным людзям за вершы, сказаў, што вельмі спяшаюся і проста... уцёк. Спачатку думаў — ад ганьбы, потым — ад шчырай, вясёлай размовы.

**А. Хаванскі,**
*г. Мінск.*

## СЛЕД НА ЗЯМЛІ

...Заліўныя лугі ў пойме Прыпяці вясковы багацей пан Кяневіч атрымаў у спадчыну мо ў часы прыгонгага права, але карыстаўся імі не толькі сам. Простыя сяляне (потым калгаснікі) таксама касілі сена. Далекавата было (ад вёскі да сенажацяў кіламетраў з дзесяць), а таму вяскоўцы — пераважна мужчыны і моладзь — з пачатку сенакосаў працавалі там з начлегамі. Курані (гэта буданы такія) ставілі ў адным і тым жа месцы — ля Гудкова каверта.

Гэтым словам у нас называлі азярыны, што заставаліся пасля паводак. Іх было многа — розных памераў і глыбінь. Настаўнік геаграфіі нават казаў, што некалі тут было мора, якое апісаў яшчэ Герадот... Аднак гэты бацька гісторыі нас, падлеткаў, цікавіў меней. Загадкай было, прычым да каверта — нейкі гудок?

Каб даведацца, пайшлі да самага старэйшага з тутэйшых дзядоў, і ён расказаў, што некалі да маёнтка пана Кяневіча вяла чыгуначная вузкакалейка, што па ёй кожную божую раніцу, з гудком, прыходзіў паравоз. (У пана былі бровар, цагельня, бондарская майстэрня і шмат лесу. Усё гэта набывалі і вывозілі купцы з іншых гарадоў.)

А ў вёсцы жыў селянін, Яўсейка. Росту быў невялічкага — метр з шапкай, дробненькі, сухарэбры, а ўжо злы... Поедам еў сваіх дамачадцаў! Прачнецца раніцай і гарлапаніць — на сыноў, на дачку, на зяця, на жонку (яны ўсе разам жылі): вам бы, маўляў, толькі спаць! Гультаі! Лайдакі! У вас жа морды ад сну папухлі! Чакаеце, пакуль я ўсё зраблю?!

І так штодня — і зімой, і ўлетку, прычым — на ўсю вёску!.. Таму людзі, слухаючы гэта, і сталі гаварыць, што адзін гудок у маёнтку, а другі ў вёсцы.

Прыляпілася да Яўсея гэта мянушка — аж да таго, што нават валасны пісар у нейкай паперы напісаў: Яўсей Гудок — не ўспомніў сапраўднага прозвішча.

...Дык вось. У адну з касавіц гэты гарлапан разам з сынамі і зяцем стаў нарыхтоўваць сена: касіць, сушыць, складваць у копы. Дзён колькі папрацавалі — харчы пад'елі, трэ было новых падвезці. Для гэтага, вечарком, маладзейшыя мужчыны махнулі дамоў — раніцой планавалі вярнуцца.

Яўсей, галодны, чакаў. А ўжо накрычаўся — аж голас сарваў:

— Я вам пакажу! Я вас накармлю, — хрыпеў на сваіх. — Вы ж, лайдачае племя, у мяне папрацуеце!

За вілы — і давай копы разбураць: сухое сена ў азярыну, у ваду насіць.

— Яўсей! Ты з што — зусім з глузду з'ехаў? — пытаюць суседзі.

А ён сена «топіць» ды гне сваё:

— Няхай ведаюць, як пазніцца, як да бацькі ставіцца!..

Многа шкоды зрабіў.

А тут і дзеці з'явіліся: два сыны яго, зяць і сват Ціт.

— Колькі вас можна чакаць?! — замест прывітанняў захрыпеў Яўсей. — Бач, прыехалі — у свіння галасы!

— До крычаць, гіцаль, — азваўся Ціт. — Учора твая дачка двух сынкоў нарадзіла. Доктара да яе прывозілі, а сёння пакуль адвезлі ў мястэчка...

Сват пра гэта расказваў, а зяць з сынамі ў гэты час хіба азіраліся ды вачыма лыпалі.

— Дзе ж сухое сена падзелася? — пыталіся ў бацькі.

Той — прыпіхлы — на азярыну паказаў... А потым схапіў вяроўку і давай лупцаваць сам сябе — па спіне, па нагах:

— Вось табе, дурню! Вось...

Ціт — мужчына магутны — трохі падумаў, паназіраў за ім.

— Ды не так ты б'еш, — кажа свату. — Дай пакажу, як трэба.

Падышоў да Яўсея, забраў вяроўчыну, галаву яго зашчаміў у сябе пад пахай і па задніцы — за ўсе яго шаленствы, за ўсю дурнату і знявагі...

Разышоўся б, адвёў душу, але зяць з сынамі спынілі — папрасілі адпусціць старога.

...Яго, Яўсея Гудка, на гэтым свеце даўно ўжо нямашака. А вось месца, дзе ён сена мачыў, засталося. І не Яўсеевым яго ў акрузе завуць, а Гудковым.

Розную памяць пакідаюць людзі.

**Н. Кандрашонак,**
*г. Петрыкаў.*

**Рубрыку вядзе**
**Валянціна ДОЎНАР.**

***АД ЯЕ Ж.***

Слушную думку не грэх паўтарыць: *«...Мне здаецца, што па смеху можна пазнаць чалавека. Калі вам з першай хвіліны прыемны смех кагонебудзь з зусім незнаёмых людзей, то смела кажыце, што гэта чалавек харошы».*

Нельга не верыць: Дастаеўскі пісаў.

І вы пішыце: конкурс на найлепшую вясёлую і праўдзівую гісторыю працягваецца.

---

Неасабісты суб'ектыў



# «Аб бессэнсоўнасці войнаў у ракурсе вечнасці»

**Караткевіч, якога вы, магчыма, не чыталі**

ІДУ да кніжнай шафы, шукаю часопіс. Ён дакладна дзесьці тут, бо нядаўна гартала. Ён не згубіўся ва ўсіх маіх пераездах, пакоях-кватэрах-інтэрнатах. Калісьці я яго беспардонна прысабечыла ў адной бібліятэцы (і сумленне мяне з гэтай нагоды абсалютна не тузае, бо бібліятэку тую, ведаю, даўно расфарміравалі, кнігі перадалі ў іншыя, а ўсю перыёдыку здалі ў макулатуру)... Вось ён, ляжыць на паліцы, крыху пакамечаны, з пажаўцелымі ўжо старонкамі. «Маладосць», адзінаццаты нумар за 1990 год. Чым ён мне так цікавы, спытаеце. У ім шмат матэрыялаў, прысвечаных Уладзіміру Караткевічу, — якраз да 60-годдзя пісьменніка. Многія друкаваліся ў той час упершыню: асабістыя пісьмы, дзённік... Вось гэты самы дзённік, апошні, датаваны ліпенем 1984 года, з каментарыямі сябра пісьменніка Валянціна Ждановіча, і хачу сёння перачытаць. Таму што сёння 25 ліпеня — роўна сорак гадоў, як Караткевіча не стала...

Я чытаю яго не першы раз. Ведаю нават некаторыя фразы на памяць. Але кожны раз не перастаю здзіўляцца. Дзённік пісаўся вельмі хворым чалавекам, якому з кожным днём станавілася ўсё горш. Умовы, у якіх ён знаходзіўся, былі абсалютна спартанскія. У тым апошнім ліпені Караткевіч з сябрамі Валянцінам Ждановічам і Пятром Драчовым выправіліся ў падарожжа па Прыпяці на надзіманым плыце, маркуючы паўтарыць маршрут 1969 года, вынікам якога стала напісанне Караткевічам шыкоўнага нарыса пра Палессе «Званы ў прадонніях азёр». (Як расказвала мне калісьці перакладчыца твораў пісьменніка на рускую мову Валянціна Шчадрына, за гэты нарыс яго чыхвосцілі аж у Маскве, на пленуме Саюза пісьменнікаў СССР — за «нацыяналістычныя матывы».) Дык вось, гэта падарожжа праз пятнаццаць гадоў задумвалася сябрамі Караткевіча як спроба вярнуць яго да жыцця: пісьменнік цяжка перажываў страту жонкі і сам зусім заняпаў у хваробу. І Уладзімір Сямёнавіч пагадзіўся, нягледзячы на тое, што адчуваў сябе не вельмі, — як сам іранічна напіша ў тым дзённіку: *«І адмірал Караткевіч, толку ад якога было, шчыра кажучы, пэўна, столькі, колькі ад адмірала Ражэственскага пад Цусімай»...*

І вось гэты хворы чалавек, які амаль нічога не есць (толькі п'е вялізную колькасць чаю, як згадвае Ждановіч), які дрэнна спіць, піша ў асабістым дзённіку — не ў творы, разлічаным на чытача, а проста ў асабістых нататках — словы, народжаныя вострым розумам, убачаныя пільным вокам. Якія большасць з нас — бадзёрых і здаровых — ніколі б не прыдумалі і не напісалі. Вось, напрыклад, пра што думае-разважае на пачатку падарожжа: *«Аб сэнсе жыцця. Аб бессэнсоўнасці войнаў у ракурсе вечнасці. Аб парадуальных магчымасцях дабра і зла. Аб іх проціборстве — у грамадстве і ў жыцці чалавека. Аб любові і каханні. Аб гераізме. Аб подзвігу. Аб смерці. Аб бессмяротнасці. Пытанні, якія юнацтва ўсіх стагоддзяў задае сабе і навакольным. І чым больш і настойлівей задае іх, тым далей не робіцца старасцю...»* А далей — параўнанні-апісанні, уласцівыя толькі яму, і такая прыгажосць мовы, і такія яскравыя вобразы, нібы сам плывеш па той Прыпяці і глядзіш на берагі: *«Вербы на пясчаным узгорку. На гэтыя вербы села такая чарада маладых шпакоў, якой мне дагэтуль не даводзілася бачыць. Спачатку яны доўга і ўпарта ганялі над берагам, дзе мы спыніліся, (луг, балотцы, зарасці вярбоўніку), вялізнага коршака. Міла было глядзець, як упарта і ў канцы з якім трыумфам...» «Сонца ўзыходзіла, перакрэсленае хмаркамі...» «Перакаты і перакаты. Ля слупа 27 км у трысьнягу палескі стажок на беразе, мне здалёк здалася хата. І купа трысьнягу на беразе, а далей, на правым беразе, дзіўны горб урвішча....» «Узгорак. На ім вербы, спавітыя ажыннікам, хмызы, парэчкі. За намі азерца, дзе кумкаюць жабы і хмызы густыя, што аж гудуць ад камарынага звону...» «Затока вельмі рыбная, б'е рыба — аж срэбныя целы плотак лятуць у паветры. Затока з ліліеямі, якія закрываюцца на ноч, вялікія-вялікія, як на кепскіх рэкламах...» «На вяршыні дрэва — гіганцкае гняздо дзікіх — яны больш асцярожныя за хатніх — буслоў. Проста велічнае дрэва, а гняздо не пляскатае, а як папаха...» «Перад Валянскім мастом Прыпяць бы ў цясніне з высокіх берагоў, а на іх дубы! Дуб упаў у ваду верхавінай. Даўно ўжо мёртвы, сухія сукі казачна выгнуліся над вадой. Даўно ўжо мёртвы, а на зямлі, што засталася між каранёў (ці можа, яе нанесла), цвітуць жоўтыя і ліловыя краскі. Прыклад табе, чалавеча...»*

ПРАЗ некалькі дзён пасля гэтага запісу, 18 ліпеня, падарожнікі вымушаны былі спыніць сваю вандроўку, каб адправіць Караткевіча, якому стала зусім блага, у Мінск. Было гэта сорак гадоў таму, і з транспартам было не так проста як цяпер. Тым больш заплылі яны ў глухі куток Палесся, якія і сёння там сустракаюцца. Так што да сталіцы дабраліся больш чым праз суткі. Караткевіч узяў абяцанне са сваіх сяброў, што яны працягнуць падарожжа. І сам паабяцаў да іх далучыцца, калі яму палепшае. Але 25 ліпеня яго не стала. Як успамінае Валянцін Ждановіч, у гэты дзень яны з Пятром Драчовым, працягваючы плыць па Прыпяці, зайшлі ва ўрочышча Галасавыя — пра гэта дзівоснае месца Караткевіч пісаў у нарысе «Сцюдзёная вясна, або 1000 год і 7 дзён». *«А пасля было дзіва. Неапісальнае. Мабыць, з апошніх такіх на нашай зямлі... Стаялі над гэтай высокай вадой дубы карказломныя, дубы-вежы, дубы, на якіх замкі можна было б будаваць, дубы-хмары ў палову неба, дубы-калоны, на якіх трымаецца неба над гэтай зямлёй...»*

ДЛЯ чаго, уласна, я так старанна сёння перапісваю гэтыя цытаты? Іх аўтар варты таго, каб аб ім памяталі, каб яго чыталі. Ён сам заўсёды казаў і пісаў, што хоча, каб чытачы з яго дапамогай адкрывалі і пазнавалі для сябе штосьці новае...

Вось і я падумала: а раптам у кагосьці няма адзінаццатага нумара «Маладосці» за 1990 год...

**Алена ЛЯЎКОВІЧ.**




Надвор'е

# Хутка адпачнём ад спёкі

**У гэтыя выхадныя нас чакае новая хваля не вельмі ўмеранага надвор'я, паведамляюць спецыялісты Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.**

У пятніцу ўмовы надвор'я ў Беларусі прадоўжыць вызначаць цёплая няўстойлівая паветраная маса, а на захадзе краіны захаваецца ўплыў атмасфернага фронту. Ноччу пераважна па заходняй частцы краіны, днём месцамі, а па захадзе на большай частцы тэрыторыі пройдуць дажджы. У асобных раёнах чакаюцца навальніцы, ноччу месцамі па захадзе краіны — моцныя дажджы. У начныя і ранішнія гадзіны ў асобных раёнах слабы туман. Вецер няўстойлівы, пры навальніцах парывісты. Тэмпература паветра ўначы ад 12 да 18 цяпла, максімальная днём — 25—30 градусаў, у заходніх раёнах Беларусі — 21—24 цяпла.

У суботу зноў будуць уладарыць цёплыя няўстойлівыя паветраныя масы. Месцамі па краіне чакаюцца кароткачасовыя дажджы і навальніцы. Вецер няўстойлівы, пры навальніцах парывісты. Тэмпература паветра ўначы ад 11 да 17 градусаў цяпла, максімальная днём будзе дасягаць 24—30.

У апошнюю нядзелю месяца ноччу надвор'е будзе вызначаць вобласць павышанага атмасфернага ціску. Удзень адаб'ецца ўплыў атмасферных франтоў ад цыклона з цэнтрам над Балтыйскім морам. Ноччу пераважна без ападкаў, а днём на большай частцы тэрыторыі краіны пройдуць кароткачасовыя дажджы, месцамі прагрымяць навальніцы. Вецер паўднёвы, з пераходам на заходні ўмераны, днём парывісты, месцамі моцны парывісты. Тэмпература паветра ноччу 12—19 градусаў, максімальная днём складзе ад 22 градусаў па захадзе да 32 спёкі па паўднёвым усходзе краіны.

У заключныя дні месяца ў краіне будзе захоўвацца няўстойлівае з ападкамі і парывістым ветрам надвор'е. Пры гэтым вецер зменіць свой напрамак на паўночна-заходні, і ў Беларусь пачнуць паступаць больш халодныя паветраныя масы. Тэмпературны фон панізіцца. Ночы стануць даволі свежымі — ад плюс 10 да 16 градусаў, днём тэмпература не перавысіць 17—25 градусаў.

Такім чынам, адпачываць ад спёкі мы будзем у панядзелак і аўторак. У гэтыя дні на большай частцы тэрыторыі краіны пройдуць кароткачасовыя дажджы. У некаторых раёнах чакаюцца навальніцы і ўзмацненне ветру. Тэмпература паветра ўначы будзе вагацца ад 10 да 16, удзень — ад 17 градусаў да 24 цяпла.

У сераду на большай частцы тэрыторыі краіны чакаюцца кароткачасовыя дажджы, месцамі магчымы навальніцы. Уначы сіноптыкі абяцаюць 10—16 градусаў, удзень — ад 18 да 25 цяпла.

**Сяргей КУРКАЧ.**

## СЁННЯ

### Сонца

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 5.14 | 21.17 | 16.03 |
| Віцебск — | 4.57 | 21.13 | 16.16 |
| Магілёў — | 5.04 | 21.07 | 16.03 |
| Гомель — | 5.07 | 20.57 | 15.50 |
| Гродна — | 5.30 | 21.31 | 16.01 |
| Брэст — | 5.38 | 21.25 | 15.47 |

### Месяц

*Поўня 21 ліпеня.*
*Месяц у сузор'і Авена.*

### Імяніны

**Пр.** *Антона, Гаўрылы, Івана, Сцяпана, Юльяна.*
**К.** *Ганны, Гражыны, Міраславы, Яўхіма, Лаўрэнція.*



Фота Ірыны ТАМКОВІЧ.

## ЗАЎТРА




## 26 ЛІПЕНЯ Даты Падзеі Людзі

У краіне

**1511** год — вялікі князь Жыгімонт Стары надаў Навагрудку, першай сталіцы ВКЛ, Магдэбургскае права.

**1944** год — войскамі 1-га Беларускага фронту ў ходзе баёў па завяршэнні акружэння фашысцкіх войскаў пад Брэстам вызвалена больш чым 20 населеных пунктаў.

**1993** год — пастановай Нацыянальнага банка Беларусі ў краіне спынялася абарачэнне савецкіх грошай і ўводзілася нацыянальная валюта. У канцы ліпеня 1993 года пачаўся вывад з абарачэння савецкіх рублёў. Беларускі рубель стаў адзіным законным сродкам плацяжоў на тэрыторыі краіны. Нягледзячы на тое што ў верасні Казахстан, Арменія, Расія, Узбекістан і Таджыкістан падпісалі дагавор аб стварэнні рублёвай зоны новага тыпу, гэтая ідэя не атрымала развіцця, і беларускі рубель так і застаўся нацыянальнай валютай.



У свеце

**1648** год — цар Аляксей Міхайлавіч склікаў баярскую думу і савет патрыярха і вырашаў з імі, што трэба зрабіць, каб устанавіць парадак і правасуддзе ў Рускай дзяржаве. Дарučана склаці новы поўны Збор законаў — Улажэнне, прынятае ў 1649 годзе.

**1856** год — нарадзіўся Джордж Бернард Шоу, англійскі пісьменнік; адзін з найбуйнейшых прадстаўнікоў «новай драмы», рэфарматар тэатральнага мастацтва. У 1931 годзе Бернард Шоу знаходзіўся ў СССР, дзе 29 ліпеня ў яго адбылася асабістая сустрэча з Іосіфам Сталіным. Апроч сталіцы, Шоу пабываў у глыбінцы — камуне імя Леніна ў сяле Іра Кірсанаўскага раёна Тамбоўскай вобласці (Ірская камуна), якая лічылася ўзорнай. Вяртаючыся з Савецкага Саюза, Шоу казаў: «Я з'язджаю з дзяржавы надзеі і вяртаюся ў нашы заходнія краіны — краіны роспачы... Для мяне, старога чалавека, складае глыбокае суцяшэнне, сыходзячы ў магілу, ведаць, што сусветная цывілізацыя будзе выратаваная... Тут я пераканаўся, што новая камуністычная сістэма здольная вывесці чалавецтва з сучаснага крызісу і выратаваць яго ад поўнай анархіі і гібелі».



**1908** год — У Парыжы фінішуюць першыя кругасветныя аўтамабільныя гонкі, старт якім быў дадзены 12 лютага ў Нью-Йорку. Першым да фінішу прыходзіць нямецкі аўтамабіль «Protos» кампаніі Siemens-Schuckertwerke GmbH, якім кіруе лейтэнант Кёппен, але пераможцам аб'яўляецца амерыканец Джордж Шустэр на аўтамабілі канструктара Томаса. Нямецкага гоншчыка аштрафавалі на 15 дзён, бо пасля паломкі яго аўтамабіль быў дастаўлены ў Сіэтл па чыгунцы, каб адплыць у Расію разам з канкурэнтамі. Лейтэнанту не саставіцца нічога іншага, як заявіць: «Я хацеў бы, каб дарогі ў Амерыцы былі такімі ж прыгожымі, як і яе людзі». Гісторыя гэтых гонак паслужыць асновай сцэнарыя папулярнай і любімай многімі кінакамедыі «Вялікія гонкі».

**1928** год — нарадзіўся Стэнлі Кубрык, амерыканскі кінарэжысёр і прадзюсар, шырока прызнаны адным з самых таленавітых, уплывовых, наватарскіх кінематаграфістаў канца XX стагоддзя.

Так гаварыў...

**Джордж БЕРНАРД ШОУ:**

*«Самае важнае — гэта навесці парадак у душы. Трымаемся трох «не»: не скардзімся, не абвінавачваем, не апраўдваемся».*

## УСМІХНЕМСЯ

**Менеджар банка тлумачыць кліенту:**

**— Мы не адабралі вашы грошы, а ўвялі камісію 100 % за зняцце грошай з рахунку.**

Аднойчы бацька злавіў мяне з цыгарэтай, вывез на сярэдзіну ракі і выкінуў з лодкі ў ваду. Вось так я і навучыўся курыць, плаваючы на спіне.

**Муж у сне:**

**— Люба, Любааа...**

**Жонка:**

**— Якая Люба?! Я — Света!**

**Муж, прачынаючыся:**

**— Эх! Люба ты мне, Света! Люба!**

Акрамя вышэйшай адукацыі трэба мець хоць бы сярэднюю кемлівасць і як мінімум пачатковае выхаванне.





ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

Рэгістрацыйнае пасведчанне нумар 2 ад 17 лютага 2009 года, выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.

ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмнай – 311 17 13 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 311 17 44, маркетынгу — 263 66 73, бухгалтэрыі — 311 17 16.

прыём рэкламы тэл./факс: 311 17 27, e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

www.zviazda.by

e-mail: info@zviazda.by (для зваротаў): zvarot@zviazda.by

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 38200000007667 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, працп. Незалежнасці, 79/1. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.

Тыраж 12.189. Індэкс 63850. Зак. № 1646. Нумар падпісаны ў 19.30 25 ліпеня 2024 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12